Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2014-11-21

# Яшчэ раз пра тую вайну

**Сумесная беларуска-польская выстаўка «Першая сусветная вайна ў матэрыялах і дакументах: з фондаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі і Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве», дзе прадстаўлены экспанаты, прысвечаныя падзеям вайны 1914 — 1918 гадоў, адкрылася ў галоўнай кніжніцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**



Фота Кастуся Дробава



*У акопах каля Смаргоні. 1917 г.*

Экспазіцыя, падрыхтаваная супрацоўнікамі бібліятэкі, знаёміць з архіўнымі матэрыяламі, публікацыямі ў перыядычным друку, успамінамі сучаснікаў і ўдзельнікаў ваенных падзей, даследаваннямі айчынных і замежных навукоўцаў. Асаблівую цікавасць уяўляюць рарытэты, якія з'явіліся падчас вайны. Прадстаўнікі розных дзяржаўных і грамадска-палітычных лагераў спрабуюць асэнсаваць падзеі таго часу. Сярод найбольш ранніх дакументальных крыніц — «Устав Белорусского Общества по оказанию помощи пострадавшим от войны» (1915), «Его Императорское Величество Государь Император Николай Александрович в действующей армии. Сентябрь — Октябрь 1914 г.» (1915), «Протоколы, постановления и материалы Всероссийского Съезда беженцев из Белоруссии в Москве 15 — 21 июля 1918 года» (1918).

Сярод мастацкіх твораў, прысвечаных Першай сусветнай вайне, — апавяданне Максіма Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» (1926), створанае на аснове дзённікавых запісаў іататак, якія пісьменнік рабіў падчас кароткіх перапынкаў паміж баямі.

Увазе наведвальнікаў прапануецца розная па жанры і чытацкай аўдыторыі грамадска-палітычная, рэлігійная і сатырычная перыёдыка: газеты «Наша ніва», «Гоман», «Belarus», «Дзянніца», часопісы «Вестник могилевского земства», «Минские Епархиальные ведомости», «Могилёвские Епархиальные ведомости», а таксама часопісы «Аполлон», «Старые годы», «Русский библиофил», якія ўвайшлі ў залаты фонд сусветнай культуры. Упершыню дэманструюцца сатырычныя часопісы, якія выходзілі тады ў Маскве і Петраградзе: «Красный смех», «Кривое зеркало», «Новый Сатирикон», «Сказка и быль». Менавіта гэтая шматжанравасць дапамагае атрымаць больш поўную карціну жыцця розных пластоў грамадства падчас Першай сусветнай вайны.

Асаблівую каштоўнасць экспазіцыі надаюць рэдкія фотаздымкі часоў Першай сусветнай, зробленыя на тэрыторыі Беларусі, — на Смаргоншчыне (былая Віленская губерня) падпаручыкам Уладзіславам Паўлюкоўскім.

Матэрыялы з фондаў Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве паказваюць падзеі вайны ў новым аспекце: адлюстроўваюць у першую чаргу лёс простых людзей, якія не толькі не хацелі вайны, але ў сваёй большасці не разумелі прычын і абставін яе пачатку і не бачылі сэнсу працягу ваенных дзеянняў. Тым не менш менавіта гэтыя людзі найбольш пацярпелі ад маштабнай імперыялістычнай бойкі. Дакументы архіва асвятляюць падзеі розных этапаў вайны пераважна на тэрыторыі Польшчы і бліжэйшага замежжа (з улікам сучасных граніц краіны-суседкі).

**Аляксандр СЦЕФАНОВІЧ,**
**загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі**

Аляксандр Сцефановіч. Яшчэ раз пра тую вайну